**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2021 г.

### <u>Мерапрыемствы, прысвечаныя 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны</u>

**У чэрвені ў публічных бібліятэках ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» працягнуўся бібліямарафон патрыятычных мерапрыемтваў «Великим огненным годам святую память сохраняя», у рамках якога праведзены мерапрыемствы для розных катэгорый карыстальнікаў.**

**2 чэрвеня**

Навучэнцы і педагогі ДУА «Стрыгаўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа» сталі ўдзельнікамі літаратурнай гасцінай «Помянем суровые годы священной строкой фронтовой». Прысутныя пазнаёміліся з нялёгкім лёсам паэтаў, чыя творчасць дапамагла нашаму народу выстаяць і перамагчы. Дзеці дэкламавалі паэтычныя радкі, спявалі ваенныя песні, атрымвалі лісты-трохкутнікі з рэкамендацыйнымі спісамі кніг пра вайну.

Стыгаўская ПБ, 27 чал.

**8 чэрвеня - 18 чэрвеня**

Цыкл мерапрыемстваў «Свет памяти, свет скорби и любви». Гасцямі сталі навучэнцы старэйшых класаў СШ № 6 і жыхары горада. Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі прысутным пра гісторыю стварэння песен Вялікай Айчыннай вайны: «Священная война», «В землянке», «Алеша», «Смуглянка», «Родина», «Катюша», «Журавли» і інш. Прыемным сюрпрызам для гасцей стала канцэртная праграма, падрыхтаваная вакальнай групай Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі «Фантазія». Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыей «Песни, пришедшие с войной».

ЦБ, 62 чал.

**14 чэрвеня**

Бібліятэка арганізавала дзень ваеннай паэзіі «Ваши жизни война рифмовала». Юныя карыстальнікі паўдзельнічалі ў гутарцы «Что такое война и что вы знаете о войне?», у літаратурнай акцыі «Прочитанная книга о войне – твой подарок ветеранам», прагледзелі сацыяльны ролік «Дети войны» і буктрэйлер «О войне мы узнаём из книг». Арганізавана кніжная выстава «Подвиг великий и вечный».

Астроміцкая ПБ, 35 чал.

**21 чэрвеня**

Падчас літаратурна-патрыятычнай гадзіны «Прикоснись сердцем к подвигу» госці даведаліся пра трагічныя падзеі пачатка вайны, праслухалі вершы, прагледзелі музычныя кліпы і прэзентацыю «Пионеры-герои». Прагляд буктрэйлера «Любимые книги о войне» сумесна з аглядам кніжнай

выставы «Пусть помнит мир спасённый» выклікаў цікавасць у дзяцей і сталых, якія ўзялі кнігі для чытання дахаты. Дзеці прымацавалі голуба, як знак міру, са сваімі імёнамі да стэнда «Мы за мир!».

Арэхаўская ПБ, 31 чал.

**22 чэрвеня**

Жыхары в. Імянін наведалі вусны часопіс «Старонкі вялікай вайны» ў бібліятэцы. Першы дзень вайны ў вёсцы Імянін звязаны з ветэранамі-землякамі Сурыным Барысам Мікалаевічам і Пуганавым Віктарам Паўлавічам. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з гісторыяй 123-га авіяпалка, змесцаванага ў гады вайны ў вёсцы Імянін, расказала пра цяжкія дні лётчыкаў у першыя дні вайны, пра подзвігі танкістаў 22-й танкавай дывізіі на подступах да Кобрына. Арганізавана выстава «Мой край не абыйшла вайна».

Імянінская ПБ, 28 чал.

**23 чэрвеня**

Падчас вечара-сустрэчы пакаленняў «Нам жить и помнить» бібліятэкар правяла ўзнагароджанне чытачоў - аматараў кніг ваеннай тэматыкі ў намінацыі «Лучший читатель». Арганізавана кніжная выстава «Страницы книг расскажут о войне», вернісаж дзіцячых малюнкаў «Защитники Отечества» і фота-стэнд ветэранаў вайны «Они прошли дорогами войны». Скончылася мерапрыемства хвілінай маўчання.

Магдалінская ПБ, 32 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу летняга чытання «Лета, книга, я - друзья»

**У чэрвені ў публічных бібліятэках ДУК стартаваў раённы конкурс летняга чытання «Лета, книга, я - друзья». У рамках конкурсу бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў.**

**4 чэрвеня**

Бібліятэка правяла свята дзяцінства «Ах, эта дивная пора». Вядучыя расказалі дзецям, у ліку якіх былі і трое дзяцей СНС, як святкуюць Міжнародны дзень засцярогі дзяцей у розных краінах, пазнаёмілі з навінамі дзіцячай літаратуры. На летняй гульнёвай пляцоўцы камандам прапанаваны займальныя конкурсы з бегам, скачкамі, эстафета з мячом, дзе юныя ўдзельнікі змаглі выявіць свае спартыўныя ўменні і навыкі. Усе атрымалі салодкія прызы, а пераможцы конкурсаў – магчымасць задарма пайграць у анлайн-гульні.

Тэвельская ПБ, 20 чал.

**4 чэрвеня**

На літаратурнай алеі «Вместе прыгнем в лето!» разам з клоўнам Клёпай дзеці ўдзельнічалі ў віктарыне «Угадай героя», у гульнях «Лекарь», «Солнышко», «Съедобное и несъедобное», у незвычайных эстафетах, чыталі вершы пра бясхмарнае дзяцінства, спявалі песні пра спорт, сяброўства і разгадвалі загадкі. Артысты лялечнага тэатра паказалі спектакль па казцы Ш. Перо «Кот в сапогах». Кніжная выстава «Все книжки в гости к нам»

прапанавала казкі народаў свету. Дзеці малявалі на асфальтавай дарожцы. Скончылася свята ўзнагароджаннем пераможцаў.

Батчынская ПБ, 25 чал.

**10 чэрвеня**

Бібліятэкар запрасіла юных карыстальнікаў у бібліядворык «Безопасное лето в библиотеке». Вядучая правяла агляд літаратуры кніжнай выставы «Твоя безопасность», якая дае простыя парады бяспечных паводзін дома, на вуліцы, на вадзе і на прыродзе. Потым дзеці здзейснілі пазнавальны круіз па станцыях «Безопасность в доме», «Дорожная азбука», «По лесным тропинкам», дзе ў гульнёвай форме разглядалі варыянты паводзін у сітуацыі, небяспечнай для жыцця ці здароўя. Дзеці з задавальненнем слухалі тэматычныя творы дзіцячых пісьменнікаў, адгадвалі загадкі, вучыліся правільна пераходзіць дарогу. Пад канец мерапрыемства кожны ўдзельнік атрымаў салодкі прыз.

Гарадзецкі філіял, 40 чал.

**17 чэрвеня**

Адбыўся літаратурна-спартыўны ігралэнд «Внимание, на старт!». Бібліятэкар расказала пра значэнне спорту і фізічнай культуры ў жыцці грамадства і кожнага чалавека, запрасіла дзяцей паўдзельнічаць у інтэлектуальных і спартыўных спаборніцтвах «Быстрее, выше, сильнее», «Передай мяч», «Кто дальше», «Кенгуру», «Прыг-скок», разгадаць крыжаванкі і загадкі. Юныя карыстальнікі з задавальненнем пазнаёміліся з кнігамі, часопісамі пра розныя віды спорту. Пераможцы атрымалі салодкія прызы.

Гарадзецкі філіял, 38 чал.

**24 чэрвеня**

З поспехам прайшла інтэлектуальная гульня «Что? Где? Когда?». Вядучая паведала камандам «Гармония» і «Следопыты» правілы гульні, прапанаваўшы тры раўнды па 10 пытанняў у кожным і адну хвіліну на абмеркаванне. Выкарыстоўваліся цікавыя факты і падзеі з розных абласцей ведаў. Пераможцы атрымалі салодкія прызы.

Гарадзецкі філіял, 43 чал.

**24 чэрвеня**

На літаратурна-гульнёвай праграме «Летние забавы» была прадстаўлена кніжная выстава «Мир книг, мир сказок, мир чудес». Вясёлая Клаунэса пагуляла з дзецьмі ў гульні «Мыши водят хоровод», «Крокодил», правяла вясёлыя конкурсы. Яны дружна адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарын. Скончылася мерапрыемства дыскатэкай у Доме культуры.

Буховіцкая ПБ, 22 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

***7 чэрвеня***

У рамках сумеснага праекта Публічнага цэнтра прававой інфармацыі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і натарыяльнай канторы

Кобрынскага раёна «Библиотека и нотариат: взаимовыгодное сотрудничество» у ПЦПІ адбыліся індывідуальныя кансультацыі натарыусаў. Жадаючым была прадстаўлена магчымасць у ходзе асабістых зносін з натарыусамі натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна Ірынай Пятроўнай Марчук, Наталляй Расціславаўнай Магуйло атрымаць адказы на пытанні.

ЦБ, *14 чал.*

***14 чэрвеня***

Для навучэнцаў старэйшых класаў СШ № 6 прайшло віртуальнае падарожжа па самым незвычайным музеям свету «Глазам своим не верю!». Супрацоўнікі бібліятэкі прапанавалі прысутным пазнаёміцца з лепшымі музеямі свету і самымі нечаканымі экспанатамі: музей падгарэлай ежы, музей бульбы фры, музей хлусні, музей гарчыцы Колман, музей плюшавых мішак, музей смеху, музей марцыпанаў і інш. Навучэнцы пазнаёміліся і з незвычайнымі музеямі Беларусі: музеем карэт, аптэкай - музеем, музеем землязнаўства, музеем камянёў, музеем ката і іншымі.

ЦБ, 28 чал.

**14 чэрвеня**

Бібліятэка сумесна з Домам культуры правялі свята вёскі «Деревня празднует рожденье, она достойна уваженья», прысвечанае 100-годдзю в. Зосіна. Прысутных з урачыстай датай павіншавалі ігумен Свята-Лукінскага храма айцец Аляксандр, старшыня Астромічскага сельвыканкама Валасюк В.П., в. а. дырэктара КСУП «Племенной завод “Дружба”» У. У. Дзмітраніца. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з гісторыяй в. Зосіна. Памятнымі дыпломамі і прызамі адзначаны самыя актыўныя карыстальнікі бібліятэкі. Бібліятэкар падрыхтавала фотавыставу «Когда мы были молодыми», адзін з раздзелаў якой прысвечаны ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, выхадцам в. Зосіна.

Лукская ПБ, 50 чал.

**15 чэрвеня**

Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка прыняла ўдзел у культурна-спартыўным рэспубліканскім фестывалі «Вытокі. Крок да Алімпу», які прайшоў у Кобрыне. Фіналам другага фестывальнага дня стаў літаратурна-музычны салон «Нашы вытокі», праведзены ў Дзіцячай школе мастацтваў. У цёплай кулуарнай атмасферы прайшла сустрэча з паэтамі – сябрамі літаратурнага клуба «ПаэтыКо», які працуе пры цэнтральнай раённай бібліятэцы, і сябрамі народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел» Палаца культуры. Тэма малой радзімы ў розных яе праяўленнях: матчына мова, бацькоўскі дом, народныя промыслы, прырода і гісторыя Кобрыншчыны і родных куточкаў – гучала ў вершах паэтаў. Шырэй з іх творчасцю можна было пазнаёміцца на кніжнай выставе «З крыніц народных чэрпаюць натхненне».

*(Елизарова, Ж. Стихи живые сами говорят / Ж. Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2021. – 19 чэрвеня. – С. 10).*

ЦБ, 63 чал.

**24 чэрвеня**

Адказы на самыя актуальныя пытанні змаглі атрымаць работнікі цэнтральнай бібліятэкі, дзіцячага філіяла і музея падчас правядзення кампетэнтнай думкі «Я говорю вакцинации: «ДА»!». У перыяд масавай вакцынацыі ад COVID-19 лекар-эпідэміёлаг дзяржаўнай ўстановы «Кобрынскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» Ірына Уладзіміраўна Ператолчына выступіла ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры, прафесійна растлумачыла прысутным пра прышчэпы і правілы правядзення вакцынацыі.

ЦБ, 25 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81